Акцыі

# КНІЖНАЯ ЭКСПЕДЫЦЫЯ Ў МІХАНАВІЧАХ

***Прыкладна на 800 выданняў павялічыўся днямі кніжны фонд Мінскай раённай цэнтральнай бібліятэкі, што ў пасёлку Міханавічы. Такі падарунак установе і мясцовым чытачам зрабілі члены ініцыятыўнай групы па падтрымцы кандыдата ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі.***

Непасрэдна зборам кніг сярод сваіх калег па пяру займаліся вядомыя пісьменнікі Мікалай Чаргінец, Таісія Бондар, добра знаёмыя з тым, якая праблема для бібліятэк — набыццё новых выданняў. «І сапраўды, — расказала дырэктар бібліятэкі Галіна Казловіч, — сярод 34 тысяч экземпляраў кніг і перыядычных выданняў нашы чытачы не заўсёды знаходзяць літаратуру, якая адпавядае іх запытам. Асабліва не хапае дзіцячых выданняў — такіх усяго 4,5 тысячы».

Між тым цэнтральную раённую бібліятэку наведваюць 800 аматараў кнігі, якім няма і 15-ці. А яшчэ ў раёне ёсць 80 дзяцей-інвалідаў, якім даводзіцца прыносіць кніжкі дамоў. Таму асабліва дарэчы РЦБ будуць, напрыклад, перададзеныя ўдзельнікамі акцыі кнігі з серыі «Я пазнаю Сусвет».

Частка падараваных выданняў трапіць у некаторыя іншыя з 41 бібліятэкі раёна. «Мы спадзяёмся, — удакладніла Таісія Бондар, — што неўзабаве такое ж папаўненне з'явіцца і ў бібліятэках іншых раёнаў вобласці і рэспублікі. Акцыя будзе мець свой працяг».

Ірына ЯКАЎЛЕВА.

**Наша жыццё. – 2001. – жніўня.**